Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 САКАВІКА 2008 г.
АЎТОРАК
№ 46 (26159)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

ПЕНСІЙНАЯ ТЭМА: ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ?

Вылічэнне стажу і каэфіцыенту, магчымасць пераходу з аднаго віду пенсіі на іншы, ільготы «датэрміноўшчыкам», змяненні ў пенсійным заканадаўстве — усё гэта стане тэмамі чарговай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.

Такім чынам, увага! Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» будзе праходзіць **сёння з 11.00 да 12.30** па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92.

Вялікабрытанія ў перспектыве можа стаць вядучым інвестарам для эканомікі Беларусі

Вялікабрытанія ў перспектыве можа стаць вядучым інвестарам для эканомікі Беларусі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 10 сакавіка на сустрэчы ў Мінску з групай брытанскіх бізнэсменаў на чале з членам Палаты лордаў парламента Вялікабрытаніі Сесілам Паркінсанам.

«Хачу запэўніць вас, што ўсё, аб чым мы з вамі дамовімся, будзе выканана няўхільна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Вы атрымаеце поўную падтрымку для работы на беларускім рынку», — дадаў ён.

«Салідны аб'ём экспарту беларускіх тавараў у вашу краіну — гэта добры паказчык, які сведчыць аб тым, што ў Беларусі ёсць значныя перспектывы асваення рынку Вялікабрытаніі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што ў эканамічных узаемаадносінах паміж Вялікабрытаніяй і Беларуссю няма ніякіх праблем.

«Што датычыцца палітыкі, упэўнены, што ўслед за стабільным развіццём эканамічнага дыялога мы наладзім добры палітычны дыялог», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

На думку кіраўніка дзяржавы, перспектывы ўзаемаадносінаў Беларусі з Еўрапейскім саюзам будуць залежаць ад самастойнасці знешняй палітыкі ЕС ад ЗША. «На жаль, перспектывы адносінаў Беларусі з Еўрасаюзам не ляжаць выключна ў плоскасці Еўропа — Беларусь», — адзначыў Прэзідэнт. «Што датычыцца адносінаў з ЕС, то, лічу, у Еўрасаюзе правільна ўсведамляюць ролю Беларусі ў Еўропе», — дадаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь з'яўляецца для ЕС вельмі важным звяном як у эканоміцы, так і ў палітыцы. Ён нагадаў, што транзітам праз нашу краіну ў Еўропу паступае больш як 20 працэнтаў спажываемага прыроднага газу, а таксама транспартуецца 40 працэнтаў нафты, якая пастаўляецца на еўрапейскія рынкі Расіяй.

У сваю чаргу лорд Паркінсан адзначыў, што, знаходзячыся з Беларусі, ён пераканаўся ў тым, што замежныя інвестары ў Беларусі могуць быць упэўнены, што кіраўніцтва краіны выканае ўсе дадзеныя ім гарантыі.

Аляксандр Лукашэнка даручыў пачаць забудову Парку высокіх тэхналогій летам

Прэзідэнт Беларусі даручыў паскорыць тэмпы праектных работ, каб ужо летам 2008 года можна было пачаць забудову асноўнай часткі тэрыторыі Парку высокіх тэхналогій. Такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў у час справаздачы дырэктара адміністрацыі ПВТ Валерыя Цапкалы.

Цяпер актыўна вядзецца будаўніцтва першага будынка, у якім размесціцца адміністрацыя, цэнтр па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў, частка кампаній — рэзідэнтаў Парку і бізнэс-інкубатар для кампаній-пачаткоўцаў, як беларускіх, так і замежных. Валерый Цапкала падкрэсліў, што «будаўніцтва асноўнай часткі ПВТ стрымліваецца працэсам праектавання».

Аляксандру Лукашэнку даложана аб выніках дзейнасці Парку высокіх тэхналогій у 2007 годзе. Так, рост аб'ёмаў вытворчасці і экспарту ПВТ у 2007 годзе ў параўнанні з 2006 годам склаў амаль 210 працэнтаў. Закранута было таксама пытанне падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы інфармацыйных тэхналогій.

Прэзідэнт пажадаў жанчынам заўсёды быць любімымі

У Беларусі шмат робіцца для забеспячэння правоў і абароны інтарэсаў жанчыны, павышэння яе грамадскага статусу. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 7 сакавіка ў Палацы Рэспублікі на ўрачыстым прыёме ў гонар Дня жанчын, які традыцыйна праводзіцца кожны год.

На прыём былі запрошаны дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі, педагогі, вучоныя, работнікі органаў дзяржкіравання, прамысловасці, сельскай гаспадаркі і сферы абслугоўвання, спартсменкі, афіцэры і супрацоўніцы сілавых структур, журналісткі, дзеячы культуры, студэнткі і хатнія гаспадыні.

У сваёй прамове Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускія жанчыны складаюць большасць насельніцтва краіны, а таму роля нашых суайчыннiц у развіцці грамадства застаецца значнай.

«Сацыяльная палітыка дзяржавы, ахова мацярынства і дзяцінства, развіццё сістэмы адукацыі і аховы здароўя нацэлены ў першую чаргу на тое, каб у краіне было як мага больш шчаслівых сем'яў, а значыць, шчаслівых жанчын», — адзначыў Прэзідэнт.

«З задавальненнем хачу падкрэсліць: сваю актыўную працоўную дзейнасць вы паспяхова сумяшчаеце з выкананнем высокага і святога абавязку мацярынства», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Шматдзетныя сем'і — асаблівы клопат дзяржавы, заявіў Прэзідэнт Беларусі. «Нас апошнім часам радуе вельмі важны для грамадства паказчык — рост нараджальнасці немаўлят», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Упершыню пасля 1995 года ў краіне перасягнуты стотысячны рубеж: нарадзіліся 103 425 дзяцей.

Напярэдадні 8 Сакавіка Прэзідэнт Беларусі ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды выдатным жанчынам краіны. «З задавальненнем выконваю гэты ганаровы канстытуцыйны абавязак», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Тэрміны некаторых выплат і падачы дэкларацый змяняюцца з 1 красавіка

Тэрміны выплаты некаторых падаткаў, збораў і арэнднай платы, падачы дэкларацый (разлікаў) у Беларусі змяняюцца з 1 красавіка. Адпаведны Указ № 145 Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 6 сакавіка.

Так, указам устанаўліваюцца тэрміны выплаты арганізацыямі зямельнага падатку і арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, арэндадаўцамі якіх з'яўляюцца сельскія, пасялковыя, гарадскія, раённыя выканаўчыя і распарадчыя органы, падатку на нерухомую маёмасць, збору ў рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельгаспрадукцыі, прадуктаў харчавання і аграрнай навукі, экалагічнага падатку. Вызначаны таксама тэрміны падачы падатковых дэкларацый па гэтых выплатах.

Указ уступае ў сілу з 1 красавіка 2008 года.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» 01.04.2008 г. в 12.00 по адресу: ул. Чкалова, 5 ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже следующего имущества, находящегося в г. Молодечно:

№ лота	Наименование имущества	Нач. цена снижена на 50 % (с НДС, руб.)
1	А/м специальный УАЗ-3303, 1991 г.в.	800 000
2	А/м специальный ГАЗ-31029, 1993 г.в.	1 415 000
3	А/м специальный ВАЗ-21099, 1997 г.в.	2 793 000
4	А/м специальный ВАЗ-2109, 1990 г.в.	1 233 000
5	А/м специальный ВАЗ-21043, 1993 г.в.	1 186 000
6	А/м специальный ВАЗ-2121, 1987 г.в.	1 541 000

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 31.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактные телефоны: (8017) 2246134, (801773) 31927, 32644.

Сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

САКАВІЦКІ ЗАГАР

МЗС Беларусі заяўляе аб нежаданні ЗША весці канструктыўны дыялог

Прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Андрэй Папоў заявіў аб парушэнні Злучанымі Штатамі Амерыкі ўзгодненага алгарытму дзеянняў па нармалізацыі адносінаў з ЕС і ЗША.

6 сакавіка Міністэрства фінансаў ЗША апублікавала растлумачэнні наконт эканамічных санкцый, уведзеных адносна канцэрна «Белнафтахім», сутнасць якіх заключаецца ў абмежаванні доступу на амерыканскі рынак прадпрыемстваў канцэрна. Як лічаць у Беларусі, краіна пайшла на поўнае ўзаемадзеянне са Злучанымі Штатамі і ЕС. Тым не менш, названыя растлумачэнні, што датычацца прадпрыемстваў «Белнафтахіма», сведчаць аб нежаданні ўладаў ЗША ісці на канструктыўны дыялог.

Як заявіў Андрэй Папоў, пасол Рэспублікі Беларусь у ЗША Міхаіл Хвастоў адкліканы ў Мінск для кансультацый. Адначасова ўрад Беларусі настойліва прапануе паслу ЗША ў Мінску Карэн Сцюарт пакінуць Беларусь з такой жа мэтай.

БЕЛТА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

СВЯТА НЕПАСЛУХМЯНАСЦІ

Па ўсім відаць, беларусы буйна святкавалі жаночае свята.

Як паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны, за мінулую пятніцу і выхадныя дні былі затрыманы 687 нецвярозых кіроўцаў транспартных сродкаў. Рэкордная колькасць п'яных за рулём была выяўлена напярэдадні і непасрэдна 8 сакавіка. У кожны з гэтых дзён былі затрыманы больш за 260 «вясёленькіх» вадзіцеляў. Для параўнання, як паведамілі ў ДАІ, у звычайныя выхадныя дні затрымліваюцца ў сярэднім 100—120 нецвярозых кіроўцаў.

Дарэчы, у нядзелю па віне п'янага вадзіцеля ў Мінску адбылося дарожна-транспартнае здарэнне са смяротным зыходам. Супрацоўнік сталічнага заапарка, які яшчэ ў снежні мінулага года быў пазбаўлены правоў, тым не менш сеў за руль, ды яшчэ ў нецвярозым стане. На вуліцы Малініна ён не справіўся з кіраваннем, сутыкнуўся з прычэпам. У выніку аварыі загінула пасажырка нецвярозага кіроўцы, таксама супрацоўніца заапарка.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

МТЗ-РІПА ВЫЙГРАЎ КУБАК «ДАРЫДЫ»

8 сакавіка, у свята жанчын і вясны, у сталічным футбольным манежы завяршыўся IV Міжнародны турнір па футболе на прызы УПП «Дарыда» і газеты «Звязда». Нагадаем, удзел у ім узялі 6 камандаў, 5 з якіх прадстаўляюць вышэйшую лігу нацыянальнага першынства («Дарыда», «Смаргонь», МТЗ-РІПА, «Нафтан» «Граніт») і клуб «Шаўляй» з Літвы. Перамогу на гэты раз святкавала сталічная каманда МТЗ-РІПА.

У фінал традыцыйна выйшла дружына мінскага раёна «Дарыда», дзе сустрэлася з падапечнымі Юрыя Пунтуса. Гэты матч мінчане выйгралі з лікам 7:3, «Дарыда» ў чацвёрты раз стала другой. Футбольны клуб «Смаргонь» стаў трэцім на турніры, менавіта гэта каманда і атрымала прыз нашай газеты — тэлевізар з дыяганаллю 72 см. Падарункі ад старэйшага беларускамоўнага выдання з фірменнай сімволікай атрымалі суддзі і арганізатары футбольнага турніру, а таксама галоўныя трэнеры камандаў-удзельніц.

Высокі арганізацыйны ўзровень турніру адзначылі прыбалтыйскія госці, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у спаборніцтвах і надалей. У сваю чаргу энергічны і ініцыятыўны генеральны дырэктар ФК «Дарыда» дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Дзялендзік запэўніў, што турніру быць і на наступны год. Яго падтрымаў і Юрый Пунтус: па тэрмінах правядзення ён арганічна ўпісваецца ў падрыхтоўку да нацыянальнага першынства. На ўрачыстай цырымоніі закрыцця IV Міжнароднага турніру на кубак «Дарыды», і газеты «Звязда» Уладзімір Дзялендзік пажадаў беларускім клубам поспеху ў нацыянальным чэмпіянаце і ў розыгрышы Кубка Беларусі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Фота Пятра ФАМІНА.

Жыллё

ЧАРГУ ЗАПЛАНАВАЛІ СКАРАЦІЦЬ ДА 5 ГАДОЎ

Згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, будаўнічая галіна да 2011 года павінна дасягнуць аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва ў памеры 10 млн квадратных метраў жылля ў год. Выканаць гэту задачу будзе цяжка, але цалкам магчыма, запэўніў начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр Горваль. Дзеля гэтага спецыялістамі галіны была распрацавана і днямі зацверджана ўрадам канцэпцыя будаўніцтва (рэканструкцыі) даступнага і камфортнага жылля для грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Канцэпцыя падрыхтавана на падставе глыбокага аналізу сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне, магчымасцяў будаўнічага комплексу і перспектыў яго развіцця, аналізу дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, жылога фонду і г.д. У выніку распрацоўшчыкі дакумента спрабуюць стварыць такі механізм развіцця будаўнічай галіны, каб усе катэгорыі насельніцтва нашай краіны мелі магчымасць пабудаваць сабе жыллё на даступных умовах і прыдатнай якасці.

Якасць і плошча жылля залежаць ад фінансаў

Аляксандр Горваль лічыць, што для неаднолькавых сацыяльных груп павінна будавацца рознае жыллё. Згодна з канцэпцыяй, для малазабяспечаных грамадзян будзе будавацца самае таннае тыповае жыллё з мінімальнай магчымай плошчай у межах сацыяльнай нормы 15 квадратных метраў на чалавека. Гэты варыянт будаўніцтва разлічаны на тых забудоўшчыкаў, якія маюць права на льготны крэдыт і субсідыю і зараз бы мелі магчымасць не ўносіць абавязковы першапачатковы ўласны ўзнос. Справа ў тым, што сёння ў Беларусі ёсць сем'і, для якіх абавязковы ўзнос у памеры 1—2 тысяч долараў з'яўляецца непасільным. У гэтым выпадку канцэпцыяй прадугледжваецца ўзводзіць панэльныя дамы паводле метаду індустрыяльнага домабудавання простых канструкцый з мінімальнымі плошчамі жылых і дапаможных памяшканняў. Такія кватэры будуць мець попыт у жыхароў інтэрнатаў, шматсямейных кватэр і сярод маладых сем'яў з невялікімі заробкамі.

Для адзінокіх грамадзян і сем'яў з двух чалавек гэтай сацыяльнай катэгорыі прадугледжаны адпакаёвыя кватэры тыповых спажывецкіх якасцяў агульнай плошчай 31—36 квадратных метраў. Для сем'яў з трох чалавек будуць прапаноўвацца кватэры агульнай плошчай 46—52 квадратныя метры, для большых сем'яў — трохпакаёвыя і чатырохпакаёвыя кватэры плошчай адпаведна 60—68 і 70—78 «квадратаў».

Для грамадзян з сярэднімі заробкамі плануецца пабудаваць тыповае жыллё з палепшанай планіроўкай. Аднапакаёвыя кватэры гэтай катэгорыі будуць мець агульную плошчу 37—45 квадратных метраў, двухпакаёўкі — 53—65, трохпакаёўкі — 79—90 «квадратаў». Да трэцяга тыпу адносіцца жыллё павышанай камфортнасці і палепшанай планіроўкі, дзе агульная плошча аднапакаёвых кватэр будзе большай за 45 квадратных метраў, двухпакаёвых — большай за 65, трохпакаёвых і чатырохпакаёвых — адпаведна большай за 80 і 90 кв. метраў.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

І так бывае!

САМЫ ДАРАГІ ПАДАРУНАК — ФАШЫСЦКАЯ КУЛЯ?

Калі гаварыць шчыра, то Галіна Кажушка вельмі ўзрадавалася гэтаму і нізка кланяецца загадчыку трэцяга хірургічнага аддзялення цэнтральнай гарадской клінічнай бальніцы Уладзіміру Канаўкову. Яшчэ б: куля тая знаходзілася ў целе жанчыны ажно 65 гадоў, аб чым яна... не ведала.

...У час Вялікай Айчыннай бацькі Галіны былі расстраляны, а трохгадовая дзяўчынка апынулася ў канцлагеры для дзяцей, якіх фашысты ператваралі ў донараў крыві. Калі пагналі ворага з беларускай зямлі, фашысты пачалі расстрэльваць і дзяцей. Адна куля крыху зачапіла скронь Галі, а другая ўпілася ў нагу... З-пад трупаў расстраляных дзяўчынку выцягнулі партызаны.

Галіна Піліпаўна ўспамінае, што ёй аказалі нейкую медыцынскую дапамогу, а затым перадалі ў дзіцячы дом. Да пенсіі яна працавала на фабрыцы ў Гомелі, выйшла замуж, нарадзіла дваіх дзяцей. На здароўе не скардзілася да таго часу, калі ў канцы мінулага лета не ўдарыла сцягно... Толькі праз паўгода яна трапіла ў вышэйпамянёную бальніцу. Як расказаў Уладзімір Уладзіміравіч, цяжэй за ўсё было паставіць дыягназ хворай. Ніхто ж не думаў, што ў назе была куля.

Аперацыю загадчык хірургічнага аддзялення Канаўкоў зрабіў па-майстэрску. Жанчына прабыла ў бальніцы два тыдні, і напярэдадні 8 Сакавіка яе адпусцілі дадому, дзе яна і папраўляецца.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Спецыяльны рэпартаж

Сакавітая СПРАВА

Першым сапраўдным званочкам прыроды аб тым, што наступіла вясна, становіцца бярозавы капеж. Яшчэ ні травінкі, ні першай красачкі на лясной глебе, а дрэвы прачынаюцца ад зімовага сну, сок спяшаецца напаіць галіны і будучыя лісточкі, якім хутка распускацца. «Сёлета, праўда, і зіма была — не зіма, бясснежная, не напаіла зямлю вільгаццю як след. Таму бярозы не вельмі многа соку змогуць аддаць», — гаворыць вопытны нарыхтоўшчык бярозавіку Людміла Козіч.

Восьмы год Людміла Мікалаеўна, выхавальніца дзіцячага садка па асноўнай рабоце, на гарачую веснавую пару для леснікоў бярэ водпуск і спяшаецца на дапамогу мужу. Нарыхтоўка соку стала ўжо своеасаблівым сямейным падрадам Козічаў. На дзянліцы яны разбіваюць лагер і на тры тыдні поўнасцю перасяляюцца сюды з кватэры. Жывуць у вагончыках, якія загадзя пераганяюць у лес. У кожным з такіх пакояў на колах размяшчаюцца тры ложкі, ёсць усё неабходнае для паходных гігіены і харчавання. Побач абсталяваны стол і месца для вогнішча.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Фота Ігні ВАКУЛІЧА.

Трэба ведаць

ЗБІРАЕМ СОК БЕЗ ПАРУШЭННЯЎ

Нарыхтоўка бярозавіку грамадзянамі для ўласных патрэбаў павінна весціся толькі ў дакладна ўстаноўленых месцах, якія ўказваюць работнікі лясгасаў. Такія змяненні дзейнічаюць ужо другі год запар.

Забараняецца нарыхтоўваць сок у населеных пунктах; прыгарадных і зялёных зонах; у дэндралагічных парках; батанічных садах; у месцах, дзе растуць рэдкія расліны і дзе пад пагрозай знікнення знаходзяцца дзікія расліны і жывёлы, што занесены ў Чырвоную кнігу; у межах акруг і зон санітарнай аховы курортаў; гісторыка-культурных запаведнікаў; археалагічных помнікаў; на тэрыторыі дамоў адпачынку; санаторыяў; у месцах масавага адпачынку насельніцтва.

За незаконнае знішчэнне, у тым ліку незаконную высечку або пашкоджанне драўніна-кустарнікавай расліннасці ў лясах першай групы дзяржлясфонду, а таксама якая не ўваходзіць у яе, уключаючы сеянцы і саджанцы, пагражае штраф ад 20 да 50 базавых велічынь, а індывідуальным прадпрымальнікам — ад 20 да 200 базавых велічынь. Тыя ж парушэнні, учыненыя ў астатніх лясах дзяржфонду, цягнуць за сабой штраф у памеры ад 10 да 30 базавых велічынь, а для індывідуальнага прадпрымальніка — ад 10 да 150 базавых велічынь. Нарыхтоўваць сок для сябе грамадзяне могуць без выпіскі ляснога білета, але пад кантролем работнікаў лясной аховы. Пасля збору нарыхтоўшчык абавязаны калочкам затрамбаваць гэта месца, не пашкодзіўшы дрэва.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Михановичский сельский исполнительный комитет Минского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов: **Лот 1** — земельный участок в п. Михановичи, площадь участка — 0,1493 га, кадастровый номер 623684204601001145, начальная цена — 30 000 000 бел. рублей; **Лот 2** — земельный участок в п. Михановичи, площадь участка — 0,1512 га, кадастровый номер 623684204601001146, начальная цена — 30 000 000 бел. рублей. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения. Залог в размере 5 % от начальной цены земельного участка и специальный сбор за участие в аукционе в размере 4 базовых величин перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за земельный участок должна быть осуществлена в течение 30 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 15.04.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.04.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион

по продаже здания столовой (об. пл. 841,0 кв.м), расположенного в г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 5. Начальная цена (снижена на 50 %) — 101 090 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка — 0,1667 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 27.11.2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 25.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 24.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Телефон (8017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ЗАО «РРБ-Банк»

сообщает, что 31.03.2008 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 23/1 состоится очередное годовое общее собрание акционеров, которое собирается по инициативе Совета директоров банка.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

— об утверждении годового отчета ЗАО «РРБ-Банк» за 2007 год;
— о распределении прибыли ЗАО «РРБ-Банк» за 2007 год;
— об избрании членов выборных органов ЗАО «РРБ-Банк».

Всю необходимую информацию по вопросам повестки дня можно получить в юридической службе ЗАО «РРБ-Банк».

Тел. 226 63 87. УНП 100361187

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 080046

КУРСЫ ВАЛЮТ

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.03.2008 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 146,00
1 еўра	3 299,48
1 латвійскі лат	4 737,83
1 літоўскі літ	955,63
1 чэшская крона	131,43
1 польскі злоты	923,92
1 расійскі рубель	90,03
1 украінская грыўня	425,37

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
USD	23,8353
10 UAH	46,7588
1000 BYR	11,0991
EUR	36,6921

Курс у гандлёвых кампаніях (на 10.03.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

На кантролі

ВЯДРО З ТАЗІКАМ ДЛЯ МЫЦЦЯ ВАЛАСОЎ І СКУРАНЫ ПАРТФЕЛЬ ДЛЯ НОЎТБУКА

Якія бытавыя паслугі аказваюцца і не аказваюцца вяскоўцам?

— Вы страцілі сумленне ў дачыненні да сельскіх жыхароў. Нельга так безадказна ставіцца да людзей, — выказаўся ў адрас некаторых кіраўнікоў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Зянон Ломаць на выязным пасяджэнні калегіі ведамства ў Гродне.

У ходзе калегіі былі разгледжаны матэрыялы праверкі эфектыўнасці выкарыстання сродкаў дзяржаўнай падтрымкі раённымі прадпрыемствамі бытавога абслугоўвання насельніцтва Гродзеншчыны. Як зазначыў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Сяргей Раўнейка, у рэгіёне ёсць прадпрыемствы, якія дастойна абслугоўваюць вяскоўцаў — гэта комплексныя прыёмныя пункты ў вёсцы Лунна Мастоўскага раёна, пасёлку Сапоцкін Гродзенскага раёна і ў шэрагу іншых населеных пунктах вобласці. Але гэта, на жаль, толькі эпізоды. Факты, выяўленыя падчас праверкі, зафіксаваны кінакамерай і прадэманстраваны перад пачаткам размовы на пасяджэнні калегіі, вельмі непрыемна ўражваюць, а асобныя, можна сказаць, шакіруюць. Неяк дзікавата для XXI стагоддзя выглядаюць, напрыклад, умовы для аказання цырульніцкіх паслуг у некаторых комплексных прыёмных пунктах Зэльвенскага і Свіслацкага раёнаў: для мыцця валасоў жанчынам прапануюцца... вядро і тазік.

Альбо вось пракатны фонд Ваўкавыскага камбіната бытавога абслугоўвання — такое ўражанне, што бачыш звалку непатрэбных рэчаў. І гэта блізка да ісціны, паколькі ўсе 59 пральных машын і 188 тэлевізараў, а таксама 59 з 86 халадзільнікаў у няспраўным стане. У апошні раз абнаўлялася складаная бытавая тэхніка больш чым 15 гадоў таму. У гэтым сэнсе больш пашанцавала Свіслацкаму ўнітарнаму камунальнаму прадпрыемству бытавога абслугоўвання насельніцтва, дзе таксама адчуваецца востры дэфіцыт пракатнага фонду. У мінулым годзе за кошт інавацыйных сродкаў Мінгандлю набылі два камп'ютары, тры прынтары і тэлевізар «Віцязь» на суму 4,8 мільёна рублёў. Як жа распарадзіліся гэтымі навінкамі? Тэлевізар аддалі ў «пракат» у кабінет дырэктара, два камп'ютары і два прынтары — у яго прыёмную і ў кабінет намесніка дырэктара. І толькі адзін прынтар быў установлены ў КПП г.п. Поразава для аказання паслуг ксеракапіравання. Хоць уся тэхніка значылася ў пракатным фондзе.

А вось у КПП вёскі Вензавец Дзятлаўскага раёна вырашылі, што калі не існуе паслугі для вяскоўцаў, то яе трэба прыдумаць для правяраючых. І дадумаліся да таго, што вывелі шланг на вуліцу і выкапалі для яго невялікую яму, стварыўшы бачнасць падключэння пральнай машыны да неіснуючай каналізацыі.

Пры гэтым кіраўніцтву ўстановы «Гроднааблбыт» грэх скардзіцца на адсутнасць дзяржаўнай падтрымкі. У 2006—2007 гадах арганізацыям, што займаюцца бытавым абслугоўваннем вяскоўцаў, на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы з розных крыніц было выдзелена 8,1 мільярда рублёў. Пры фінансавай падтрымцы дзяржавы летась усе 17 прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання выйшлі на бясстратную работу. Аднак эфектыўнасць выкарыстання набытага за кошт дзяржпадтрымкі абсталявання ў многіх прадпрыемствах нулявая. Напрыклад, на складзе Зэльвенскага раённага ўнітарнага прадпрыемства бытавога абслугоўвання захоўваліся 33 адзінкі новага абсталявання для аказання цырульніцкіх паслуг, а таксама паслуг па рамонце абутку, пашыве адзення і іншых на суму 14,4 мільёна рублёў. У Дзятлаўскім камбінаце бытавога абслугоўвання насельніцтва не выкарыстоўваліся завезеныя ў сельскія КПП два рабочыя месцы абутніка, два цырульніцкія блокі, крэсла з мыйкай, аверлок, дзве пральныя машыны на 7,8 мільёна рублёў.

Такое стаўленне да сродкаў дзяржаўнай падтрымкі не было своечасова папраўлена «Гроднааблбытам». Больш за тое, кіраўніцтва абласной структуры само груба парушала нарматыўныя акты пры выкарыстанні дзяржаўных сродкаў. У кастрычніку мінулага года праз аўкцыён прадалі адзін з будынкаў, выручаныя сродкі аблвыканкам дазволіў накіраваць на рэканструкцыю, тэхнічнае пераўзбраенне і мадэрнізацыю вытворчасці. Аднак начальнік установы «Гроднааблбыт» Уладзімір Спорык палічыў прыярытэтным іншае пытанне — павышэнне камфортнасці свайго рабочага месца і службовага транспарту. Для начальніка набылі: аўтамабіль «Фольксваген Пасат» коштам 68,2 мільёна рублёў (у распаражэнні ўстановы мелася і эксплуатавалася толькі чатыры гады службовая «Волга» павышанай камфортнасці), ноўтбук з камплектуючымі коштам 3,7 мільёна рублёў разам са скураным партфелем за 570 тысяч рублёў і сумкай за 110 тысяч рублёў, а таксама кандыцыянер за 1,7 мільёна рублёў.

Здавалася б, факты разбазарвання дзяржаўных сродкаў відавочныя. Аднак Уладзімір Спорык лічыць інакш. Паводле яго пярэчанняў, накіраваных у Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці, і службовы аўтамабіль прэстыжнай маркі, і кандыцыянер у кабінет, і іншыя рэчы набыты з мэтай выканання асноўнай функцыі ўстановы — эфектыўнага кіравання падведамаснымі арганізацыямі.

І вось як кіруюць. У Дзятлаўскім раёне з 14 КПП у дзень праверкі былі зачынены 10 — прыёмшчыкі заказаў знаходзіліся ў водпусках альбо адсутнічалі. У будынку КПП вёскі Сакольнікі Свіслацкага раёна адключана ацяпленне і больш за год няма электрычнасці. У вёсцы Дзярэчын Зэльвенскага раёна, дзе пражывае каля 700 чалавек, Дом быту зачынены ў 2001 годзе, а КПП размешчаны ў бытавым памяшканні лесапільнага цэха і займаецца толькі рэалізацыяй выраблеых там рытуальных рэчаў...

Удзельная вага бытавых паслуг прадпрыемстваў дзяржаўнай установы «Гроднааблбыт» у агульным аб'ёме рэалізацыі гэтых паслуг насельніцтву вобласці пастаянна скарачаецца.

«Як жа тады выконваліся прагнозныя паказчыкі?» — зацікавіўся Камітэт дзяржкантролю. І зрабіў выснову, што шэрагам райвыканкамаў і «Гроднааблбытам» дапускаліся факты неабгрунтаванай карэкціроўкі даведзеных прадпрыемствам паказчыкаў па тэмпах росту аб'ёмаў платных (бытавых) паслуг у бок зніжэння. І такім чынам забяспечвалася выкананне гэтага параметра. Фактычна ж у Гродзенскай вобласці аб'ём бытавых паслуг праз усе каналы рэалізацыі не дасягнуў прадугледжанага рэспубліканскай Праграмай развіцця бытавога абслугоўвання насельніцтва ўзроўню.

Дарэчы, «Гроднааблбытам» не была распрацавана і прадастаўлена на зацвярджэнне ў аблвыканкам адпаведная абласная праграма на 2006—2010 гады. Таксама не распрацоўваліся ў 2006—2007 гадах паказчыкі развіцця бытавога абслугоўвання насельніцтва ў сельскай мясцовасці ў прагнозах сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці і раёнаў.

На 1 студзеня гэтага года ў вобласці працуе 247 комплексных прыёмных пунктаў. Аб'ёмы бытавых паслуг вяскоўцам фарміраваліся ў асноўным за кошт рэалізацыі вырабленых дробнымі партыямі швейных, трыкатажных вырабаў і прадукцыі рытуальнага прызначэння. Удзельная вага такіх паслуг у агульным аб'ёме аказаных вяскоўцам паслуг склала амаль 80 працэнтаў. Пры гэтым большасць прадпрыемстваў «бытоўкі» не цікавіць укараненне такіх відаў паслуг, як апрацоўка зямельных участкаў, размол збожжа, рамонт печаў, перапрацоўка сельгаспрадуктаў, пракат сродкаў малой механізацыі і садова-агароднага інвентару і іншых. Такія запатрабаваныя і высокадаходныя віды паслуг, як рамонт і будаўніцтва жылля, не аказвалі 12 прадпрыемстваў, выраб мэблі — 8. Зэльвенскім і Іўеўскім прадпрыемствамі бытавога абслугоўвання не прадастаўляліся фотапаслугі.

Пракатны фонд Ваўкавыскага камбіната бытавога абслугоўвання.

Дык у прыватнікаў трэба павучыцца. Паводле даных установы «Гроднааблбыт», летась было заключана восем дагавораў з раённымі вузламі сувязі па зборы заказаў у сельскіх жыхароў на рамонт абутку, швейных і трыкатажных вырабаў і аказана паслуг на 8,5 мільёна рублёў. Фактычна ж, як паказала праверка, заключылі сем дагавораў, па якіх у чатырох раёнах наогул нічога не зрабілі, а ў астатніх трох аб'ём паслуг склаў 1,2 мільёна рублёў. А цяпер адчуйце розніцу. Індывідуальны прадпрымальнік Д. Вераціла з Ваўкавыска па дагаворах з вузламі сувязі чатырох раёнаў аказаў паслуг па рамонце абутку на 89,9 мільёна рублёў.

Такім чынам, прыватнік эфектыўна працуе, а дзяржаўная структура «праглынае» сродкі дзяржпадтрымкі і прыхарошвае сітуацыю скажэннем справаздачнасці, стварае бачнасць выканання прагнозных паказчыкаў. Факты прадастаўлення ў органы дзяржаўнай статыстыкі несапраўдных дадзеных аб аб'ёмах аказаных паслуг установлены ў Ваўкавыскім, Воранаўскім, Свіслацкім, Шчучынскім прадпрыемствах бытавога абслугоўвання.

— Думаю, што пасля сённяшняй размовы ўсе кадры, і не толькі гродзенскія, зробяць неабходныя высновы, — падкрэсліў Зянон Ломаць. — Гэта датычыцца і Міністэрства гандлю, якое самаўхілілася ад арганізацыі бытавога абслугоўвання насельніцтва.

Верагодна, што пасля калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі некаторыя кіраўнікі развітаюцца са сваімі пасадамі. Міністэрству гандлю рэкамендавана разгледзець пытанне аб мэтазгоднасці ліквідацыі абласных установ бытавога абслугоўвання, якія функцыянуюць паралельна з упраўленнямі гандлю і паслуг аблвыканкамаў, і стварэння пры гэтых упраўленнях адпаведных структурных падраздзяленняў па арганізацыі бытавога абслугоўвання насельніцтва. У месячны тэрмін Мінгандлю сумесна з аблвыканкамамі трэба будзе праінвентарызаваць наяўнасць у раённых прадпрыемствах бытавога абслугоўвання набытага за кошт сродкаў дзяржаўнай падтрымкі абсталявання і прыняць меры для яго рацыянальнага выкарыстання.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Лунінец стаў апошнім месцам правядзення абраду провадаў зімы на Брэсцкім Палессі (у іншых райцэнтрах святы адбыліся на тыдзень раней). Катанне на кані, выступленне фальклорных калектываў і спальванне сімвала зімы па традыцыі прайшлі на галоўнай плошчы горада — любімым месцы народных гулянняў у лунінчан.

Пытальнік

Колькі плаціць за газ?

З пачатку гэтага года павялічыліся тарыфы на шэраг жыллёва-камунальных паслуг. У адпаведны пералік трапілі і расцэнкі за прыродны газ. Мая кватэра размешчана ў доме з цэнтральным ацяпленнем і абсталявана прыборам уліку «блакітнага паліва», газавай плітой, а таксама газавым воданагравальнікам. Растлумачце, калі ласка, колькі неабходна заплаціць за газ, калі расход склаў 20 куб. метраў?

А.В. ІОДА, *г. Валожын*

Як растлумачыў «Звяздзе» выконваючы абавязкі генеральнага дырэктара вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскаблгаз» Валянцін Серавкі, пастановай урада ад 18 студзеня 2008 года зацверджаны новыя цэны на прыродны і звадкаваны газ для насельніцтва. У шматкватэрным доме з цэнтральным ацяпленнем пры наяўнасці прыбораў уліку, газавай пліты, а таксама газавага воданагравальніка тарыф складае 376 рублёў за 1 куб. метр. Такім чынам, калі вы спажылі 20 «кубоў», то за газ неабходна заплаціць 7520 рублёў.

«Крылаты драпежнік знішчае ўсю нашу радасць...»

Дапамажыце нам разабрацца: чым такая каштоўная птушка арол? Мы жывём у сельскай мясцовасці і любім прыроду, жывёльны свет. Але гэты драпежнік у хуткім часе знішчыць усю нашу радасць. Раней увесну выйдзеш з дому і — не можаш наслухацца спеваў птушак. А цяпер арлы цалкам знішчылі і шпакоў, і дзікіх галубоў; цецерука і глушца нідзе не ўбачыш. Дабраліся і да свойскай птушкі: цэлую зіму яе корміш, а ўвесну ўсю перадушаць. Драпежнікаў жа ахоўваюць, але нам падаецца, што гэта вялікая памылка.

Георгій Паўлавіч ДАРАШЭВІЧ, *Навагрудскі раён.*

Адказы на пытанні чытача нам дапамаглі даць спецыялісты-арнітолагі дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Навукова-вытворчы цэнтр НАН Беларусі па біярэсурсах». Зразумела, прыблізныя, паколькі дакладна вызначыць від птушкі можа толькі прафесіянал. Драпежнікаў розных відаў звычайны чалавек часам аб'ядноўвае ў нейкі адзін зборны вобраз, хоць у іх можа быць розная спецыялізацыя ў плане паляўнічай здабычы (дарэчы, некалькі гадоў таму ў рэдакцыю паступала ўжо аналагічнае пытанне).

У краіне сапраўды сустракаецца арол-беркут, але даволі рэдка. Гняздуецца ён пераважна на поўначы Віцебскай вобласці. Ёсць у нас таксама вялікі і малы падорлік, арлан-белахвост, канюк, каршун, ястраб-цецеравятнік. Калі апошні палюе пераважна на дробных птушак, дык беркут у якасці здабычы можа абрацца і цецерука, і зайца. Шкоду свойскай птушцы могуць наносіць і тхор, і ласка, а наступствы гэтых набегаў людзі часам спісваюць на крылатага драпежніка.

Некаторыя з пералічаных вышэй відаў драпежных птушак занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, некаторыя — не. Аднак знішчаць іх усіх аднолькава забаронена, паколькі прыродзе можа быць нанесены ўрон. Увогуле, пытанні рэгулявання колькасці дзікіх відаў жывёлы знаходзяцца ў кампетэнцыі прыродаахоўных арганізацый. Яны ж могуць правільна падлічыць і нанесены драпежнікамі ўрон, калі ён сапраўды быў. Таму чытачу лепш звярнуцца або ў раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, або ў міжраённую інспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету.

Калі ж вярнуцца да свойскай птушкі, дык абараніцца ад крылатых драпежнікаў (калі гэта ўсё ж менавіта яны наносяць урон вяскоўцу) можна адным простым, але дзейсным спосабам. Трэба вальеры для выгулу свойскай птушкі абцягнуць буйнаячэістай сеткай, у тым ліку і плеценай.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

У рэдакцыю працягваюць паступаць звароты чытачоў з просьбамі дапамагчы атрымаць ім адказы адносна льгот. У прыватнасці, мінчанін (адрас і прозвішча ў рэдакцыі ёсць, заяўнік прасіў іх не ўказваць) — колішні непаўналетні вязень (турмы) — пытаўся: якія льготы захаваны цяпер для гэтай катэгорыі грамадзян. Пры гэтым ён прасіў удакладніць: якія льготы маюць непаўналетнія вязні згодна з падпісанымі раней нашай краінай міжурадавымі пагадненнямі.

Запыт чытача па просьбе «Звязды» быў разгледжаны ва ўпраўленні дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

У межах сваёй кампетэнцыі паведамляем, што ў рамках праводзімай работы па ўпарадкаванні дзеючай сістэмы сацыяльных ільготаў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 года «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» (уступіў у сілу з 17 снежня 2007 года). Указаным Законам скарочаны некаторыя льготы асобным катэгорыям грамадзян, у тым ліку і колішнім вязням фашызму, членам сем'яў загінулых (памерлых) ваеннаслужачых, ветэранам працы і Узброеных Сілаў, ветэранам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў.

«Дзяржаўныя сацыяльныя льготы і гарантыі грамадзянам — у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам»

Разам з тым за колішнімі паўналетнімі вязнямі турмаў, канцлагераў і гета, а таксама за колішнімі непаўналетнімі вязнямі іншых месцаў прымусовага ўтрымання захаваны наступныя правы і льготы: павышэнне памераў пенсій на 100 працэнтаў мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце і льготнае падаткаабкладанне ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь; атрыманне льготных крэдытаў, дапамог на будаўніцтва (рэканструкцыю) ці набыццё жылых памяшканняў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь; бясплатная перадача ва ўласнасць (з улікам жыллёвай квоты, сумы квот) займаемых імі жылых памяшканняў у межах 20 квадратных метраў агульнай плошчы на сябе і кожнага непрацаздольнага непрацуючага члена яго сям'і, які пражывае разам з ім, з захаваннем прынцыпу аднаразовасці выкарыстання дадзенай льготы; першапачатковае ўступленне ў арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў, гаражныя, дачныя кааператывы, садаводчыя таварыствы; карыстанне пры выхадзе на пенсію паліклінікамі, да якіх яны былі замацаваны ў перыяд работы (службы), бясплатнае атрыманне медыцынскай дапамогі ў дзяржаўных лячэбна-прафілактычных установах; першачарговае абслугоўванне ва ўстановах аховы здароўя, першачарговая шпіталізацыя; ільготы ў галіне працоўных адносінаў.

Колішнім вязням, прызнаным інвалідамі I ці II групы ў выніку агульнага захворвання, працоўнага калецтва ці іншых прычын (за выключэннем асобаў, інваліднасць якіх наступіла ў выніку супрацьпраўных дзеянняў) даецца: 90-працэнтная скідка ад кошту лекаў, бясплатнае зубапратэзаванне, бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога і прыгараднага пасажырскага транспарту, а тым, хто пражывае асобна ад працаздольных членаў сям'і, — 50-працэнтная скідка ад кошту жыллёва-камунальных паслуг.

У Рэспубліцы Беларусь дзяржаўныя сацыяльныя льготы і гарантыі даюцца грамадзянам у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны не надзелена правам тлумачэння дзеяння нормаў міжурадавых пагадненняў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАДПОЛЬНЫЯ ПАДШЫПНІКІ

У Івацэвічах супрацоўнікі Баранавіцкага міжрайаддзела фінансавых расследаванняў КДК па Брэсцкай вобласці выявілі склад, на якім захоўвалася больш за 34 тысячы падшыпнікаў для сельгастэхнікі.

Прадукцыя была завезена з Расійскай Федэрацыі без адпаведных дакументаў.

Што будзе з падшыпнікамі, кошт якіх 150 мільёнаў, вырашыць суд.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Жамчужыны Айчыны

АПОСТАЛЫ ВЯРТАЮЦЦА Ў ХРАМ

Галоўны алтар Фарнага касцёла будзе адноўлены

Ліпеньскай ноччу 2006 года многіх жыхароў цэнтральнай часткі Гродна разбудзілі званы кафедральнага касцёла святога Францыска Ксаверыя (Фарнага). Яны былі аўтаматычна ўключаны камп'ютарам, які «завіс» ад пашкоджання ў электрасеткі. Пажар!

Работа баявых разлікаў падраздзяленняў МНС Гродзенскага гарнізона ўскладнялася моцным задымленнем, слуп агню дасягаў па вышыні сарака метраў і бачнасць была амаль нулявая. Тым не менш дзякуючы прафесіяналізму выратавальнікаў наступствы пажару ўдалося мінімізаваць. Хоць страты аказаліся жудаснымі і, як тады здавалася, абсалютна непапраўнымі. Полымя ахапіла правую частку галоўнага алтара, практычна цалкам знішчыўшы чатыры фігуры апосталаў і святых, а таксама размешчаныя ў гэтым месцы калоны і драўляную панэль.

Пажар у Фарным касцёле адразу ж пачаў абрастаць рознымі чуткамі і вось нядаўна, пасля мноства даследаванняў і экспертыз было вынесена афіцыйнае заключэнне аб яго прычыне. Як паведамляла ўжо «Звязда», агонь быў справакаваны кароткім замыканнем электраправодкі ў раёне падсветкі на галоўным алтары. Яе мантаж праводзіўся рабочымі з Польшчы без неабходнай праектнай дакументацыі. Непрафесійна пракладзеная электраправодка, праслужыўшы нейкі час, усё ж прывяла да пажару.

На прэс-канферэнцыі па гарачых слядах гэтай бяды ў пробашча касцёла Яна Кучынскага спыталі аб фінансавых маштабах прычыненых пажарам стратаў. «Нейкім грашовым эквівалентам іх сувымераць нельга, алтар бясцэнны», — адказаў ксёндз. У чым і пераконвае знаёмства з гісторыяй яго стварэння.

Кафедральны касцёл у Гродне, які названы ў гонар хрысціянскага місіянера, сузаснавальніка ордэна Іезуітаў святога Францыска Ксаверыя, быў асвечаны ў 1705 годзе ў прысутнасці караля польскага, Вялікага князя літоўскага Аўгуста II і расійскага імператара Пятра I. Акрамя касцёла і манастыра ў гэты комплекс, які займаў цэлы квартал у цэнтральнай частцы горада, уваходзілі калегіум, аптэка, бібліятэка і шэраг гаспадарчых памяшканняў. Дарэчы, старэйшая на тэрыторыі Беларусі аптэка сёння, праз больш чым тры стагоддзі не толькі прапануе разнастайныя лекавыя сродкі, але і з'яўляецца музеем, знаёмячы з гісторыяй фармацэўтычнай справы на нашых землях. А яшчэ адна славутасць — гэта ўстаноўлены ў 1725 годзе на вежы Фарнага касцёла гадзіннік, унікальны помнік сярэдневяковай тэхнікі, старэйшы маятнікавы гадзіннік з вядомых на прасторы былога СССР.

Аптэка-музей і вежавы гадзіннік — гэта цяпер, можна сказаць, ужо неад'емныя складнікі «візітнай карткі» горада над Нёманам. А вось пра галоўны алтар Фарнага касцёла шырокай грамадскасці вядома значна менш. Хоць ён не мае аналагаў у свеце і з'яўляецца сапраўдным шэдэўрам мастацкай думкі.

У 1707 годзе, праз два гады пасля асвячэння Фарнага касцёла, у Гродне пабываў вядомы польскі архітэктар Кшыштаф Паукер з горада Рашэль, што непадалёк ад Ольштына. Менавіта ён увасобіў у малюнку праект алтара. А кантракт на выраб алтара ў 1736 годзе Гродзенскі іезуіцкі калегіум заключыў з таксама рашэльскім майстрам Янам Шмідтам. Згодна з дамоўленасцю, скульптару дапамагалі шасцёра рэзчыкаў па дрэве і адзін «хлопчык» — вучань. З Рашэля былі дастаўлены неабходныя інструменты і ўжо вырабленыя там фігуры Святога Ксаверыя і Хрыста Спасіцеля. Над іншымі скульптурамі для алтара Ян Шмідт і яго памочнікі працавалі, верагодна, у Гродне, папярэдне нарыхтаваўшы на тэрыторыі Прынямоння і давёўшы да патрэбных кандыцый ліпавую драўніну.

Алтар быў выраблены ў стылі барока і па сваёй велічы цалкам адпавядаў тагачаснаму статусу аднаго з найбагацейшых касцёлаў Рэчы Паспалітай. «Лес калон і скульптур» — так у сярэдзіне XVIII стагоддзя пісаў пра яго ў дарожных нататках прускі вандроўнік Шлемюллер. Такое ўражанне галоўны алтар Фарнага касцёла пакідае і сёння, нават у пакуль неадроджаным стане. Кампазіцыя складаецца з Шмідтам тэхналогію вырабу фігур, а таксама адсутнасцю аналагаў гэтага алтара ў іншых храмах. Але, дзякуй Богу, звесткі аб страчаным захаваліся і з'явілася надзея на яго адраджэнне.



У гэтым можа цяпер пераканацца кожны, пабываўшы ў Фарным касцёле. Праца па аднаўленні алтара ідзе! Знайшліся фінансавыя сродкі — ахвяраванні прыхаджан, з іншых прыходаў Беларусі і замежжа. Не абдзелены Прынёманскі край і майстрамі, годнымі Яна Шмідта і яго памочнікаў — гэта найперш вядомы мясцовы плотнік, сталяр Мечыслаў Алешчык і рэзчык па дрэве з Воранава Казімір Місюра. Багаты ў іх паслужны спіс, але, безумоўна, такой адказнай работы яшчэ не было. І яны не адразу, а толькі пасля глыбокага асэнсавання задачы, далі згоду.

Мяркуецца, што гады праз два-тры фігуры апосталаў і святых, за выраб якіх узяўся воранаўскі майстар, вернуцца на свае ранейшыя месцы ў храме. Зрэшты, шмат ужо зроблена і на сёння. Набывае ўсё больш завершаны выгляд аснова, дзе размяшчаюцца ўсе элементы алтара — драўляная панэль, з ёй, як і раней, арнанічна спалучаюцца арабескі, кансолі, мадульены. Выкарыстоўваюцца граб, ясень, ліпа, дуб і іншыя пароды. Зразумела, паўтарыць старажытныя спосабы падрыхтоўкі матэрыялаў немагчыма, але, з іншага боку, у нашых продкаў не было і сённяшніх тэхналогій. У прыватнасці, вакуумнай сушылкі, якая дазваляе да мінімуму скараціць тэрмін давядзення драўніны да неабходных кандыцый.

Дарэчы, другое жыццё будзе вернута не толькі пацярпелай ад пажару правай частцы алтара, будуць адноўлены і некаторыя страчаныя архітэктурныя элементы ў левай частцы. Усе гэтыя і іншыя каштоўнасці не павінны быць зноў пастаўлены пад пагрозу няспраўнай электраправодкай і іншымі праблемамі, для чаго (і не толькі ў гэтым храме) трэба зрабіць усё неабходнае на пытаннях проціпажарнай бяспекі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БЕЛТА.

На Слонімскім мясакамбінаце віталі холад

Нягледзячы на тое, што вясна набірае абароты, на Слонімскі мясакамбінат завітаў сапраўдны холад. Прычым работнікі прадпрыемства з 85-гадовай гісторыяй, не хавалі радасці ад яго прыходу. І прычына таму вельмі важная...

Гэтымі днямі на ААТ «Слонімскі мясакамбінат» сіламі айчыннай кампаніі «Холадспецмантаж» быў здадзены ў эксплуатацыю першы пускавы комплекс аміячна-кампрэсарнай станцыі і халадзільніка. На ўрачыстай сустрэчы было адзначана, што ўвядзенне ў строй новага суперсучаснага халадзільнага абсталявання галандскай фірмы Grasso — сусветнага лідара ў сваёй галіне, гэта важны крок у далейшым дынамічным развіцці і дасягненні яшчэ большай эфектыўнасці ў энергазберажэнні. Акрамя таго, як падкрэслілі старшыня Слонімскага райвыканкама Мечыслаў Касцюк і генеральны дырэктар мясакамбіната Вячаслаў Нарута, новы цэх — гэта сапраўднае ноў-хаў еўрапейскага ўзору, дзе ўдала стасуюцца кампактнасць, сучаснасць і экалагічная бяспечнасць вытворчасці.

Дарэчы, цяперашні пуск новага аміячнага комплексу на Слонімшчыне, нагадалі спецыялісты ТАА «Холадспецмантаж» — першы за амаль апошнія два дзесяткі гадоў на айчынных прадпрыемствах мясаперапрацоўчай галіны.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

НА ФОТА: галоўны інжынер ААТ «Холадспецмантаж» Ігар СКРЫННІК (злева) перадае сімвалічны ключ ад першага пускавога комплексу аміячнай кампрэсарнай станцыі і халадзільніка генеральнаму дырэктару ААТ «Слонімскі мясакамбінат» Вячаславу НАРУЦЕ.

ЧАРГУ ЗАПЛАНАВАЛІ СКАРАЦІЦЬ ДА 5 ГАДОЎ

Ад двухпавярховак да хмарачосаў

Канцэпцыяй прадугледжана ажыццяўляць нават у буйных гарадах краіны будаўніцтва жылых дамоў самай рознай павярховасці. У залежнасці ад горадабудаўнічых задач будуць узводзіцца, напрыклад, двухпавярховыя блакіраваныя дамы або нават 20—30-павярховыя жылыя комплексы.

Для масавай забудовы самымі эканамічнымі лічацца панэльныя дамы ад 5 да 9 паверхаў. Спецыялістамі падлічана, што самы танны квадратны метр жылля атрымліваецца пры індустрыяльным будаўніцтве дамоў менавіта такой аптымальнай павярховасці.

Жыллёвыя спадарожнікі праз 2—3 гады

Цяпер дэталёва разглядаюцца варыянты стварэння гарадоў-спадарожнікаў, што ў першую чаргу характэрна для нашай сталіцы. У якасці прэтэндэнтаў вызначаюцца бліжэйшыя да Мінска раённыя цэнтры і такія населеныя пункты, як Гатава і Заслаўе, дзе ёсць магчымасці перспектыўнага будаўніцтва буйнога жылога фонду, улічваючы лёгкую транспартную даступнасць да сталіцы ў межах гадзіны. Зараз, напрыклад, каб дабрацца з аднаго краю Мінска да другога, патрэбна нават больш часу, чым з Заслаўя да сталіцы. Цяпер гэта толькі перспектыўны накірунак, бо сёння больш эканамічным метадам з'яўляецца асваенне пад жыллёвае будаўніцтва свабодных тэрыторый да кальцавой дарогі Мінска. На дату вычэрпван-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ня ўнутрыгарадскіх зямельных рэсурсаў будаўнічая галіна павінна падрыхтаваць праектныя і тэхнічныя рашэнні аб асваенні суседніх тэрыторый. Цяпер разглядаецца магчымасць далучэння Мінскага раёна да Мінска, каб паскорыць працэс асваення існуючых зямель за кальцавой дарогай.

У чарзе — не больш за 10 гадоў

Усе агучаныя мерапрыемствы будаўнічай галіны будуць накіраваны найперш на скарачэнне перыяду чакання атрымання жылля для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. На першым этапе ўсе структуры Мінбудархітэктуры павінны спрацаваць такім чынам, каб да 2011 года ўсе грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, чакалі сваёй чаргі на будаўніцтва кватэры не больш за 10 гадоў. На другім этапе, які разлічаны да 2015 года, жыллёвая чарга павінна скараціцца да 5 гадоў. Відавочна, што такія тэрміны чакання жыллёвай чаргі цяпер аптымістычныя толькі для бясквацэрных жыхароў галоўнага мегаполіса краіны. У рэгіёнах жыллёвыя чэргі ўжо істотна карацейшыя, а праз акрэслены перыяд могуць увогуле амаль знікнуць.

Неабходна будаваць не менш як 90 тысяч кватэр штогод

Летась у чарзе маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у краіне было каля 623 тысяч грамадзян і сем'яў, з якіх 153 тысячы чакаюць у жыллёвай чарзе больш за 10 гадоў. Найбольшая колькасць з жыллёвымі праблемамі прыпадае на жыхароў гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу, дзе ў чарзе стаіць 576 тысяч грамадзян. Каб істотна скарачаць чаргу, трэба ў 2009 годзе пабудаваць 25 працэнтаў тыповага жылля, тыповага жылля з палепшанай планіроўкай — 67 працэнтаў, жылля павышанай камфортнасці — 7,5 працэнта. Канцэпцыя даступнага жылля прадугледжвае, што ў 2010 годзе ў краіне будзе пабудавана не менш як 90 тысяч кватэр і індывідуальных дамоў. Між іншым, толькі ў сталіцы сёння ў жыллёвых чэргах стаяць каля 205 тысяч грамадзян.

Цэны на жыллё будуць рэгулявацца

Кошт будаўніцтва жылля для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і ўвогуле для будаўнічага комплексу краіны, будзе і надалей рэгулявацца дзяржавай. Згодна з канцэпцыяй, кошт жылля можа павялічвацца ў разумных і эканамічна абгрунтаваных межах. Да кошту жылля забараняецца прыплюсоўваць затраты, звязаныя з безгаспадарчасцю ў тэхнічнай і арганізацыйных сферах будаўніцтва, пры выкарыстанні няякасных матэрыялаў, пры зацягванні тэрмінаў будаўніцтва і г.д.

Згодна з пастановай Саўміна краіны № 29, сёлета вызначаны грашовыя ўзроўні кошту будаўніцтва жылля. У рэальных лічбах атрымліваецца, што кошт квадратнага метра агульнай плошчы панэльнага жылля для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, складзе цяпер каля 450—500 долараў і 550—600 долараў па кватэрах у цагляных дамах. Тут трэба дадаць, што, згодна з зацверджанымі індэксамі будаўніча-мантажных работ, жыллё сёлета можа падаражэць для «чаргавікоў» максімум на 12 працэнтаў.

Даходныя дамы — альтэрнатыва інтэрнатам?

Асобным блокам у канцэпцыі Мінбудархітэктуры вызначаецца накірунак стварэння сацыяльнага жылля, якое будзе здавацца жыхарам гарадоў у сярэдне- і доўгатэрміновую арэнду. У такіх дамах павінны быць розныя па плошчы і якасці кватэры, каб задаволіць попыт усіх сацыяльных груп патэнцыяльных кватарантаў. Гэта могуць быць сем'і з сярэднімі даходамі, якіх не задавальняюць умовы жылля ў інтэрнатах, або спецыялісты, якія разлічваюць працаваць і жыць у вызначаным горадзе абмежаваны прамежак часу.

Стварэнне даступных дамоў стала патрабаваннем часу, калі істотна актывізавалася працоўная міграцыя насельніцтва як у межах краіны, так і на міжнародным узроўні. Сёння ў свеце каля 50 працэнтаў жылля прыпадае на шматкватэрныя дамы, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці гарадоў. У Беларусі доля ўласнага жылля грамадзян складае 97 працэнтаў ад усяго жыллёвага фонду краіны.

Арэндную плату ў такіх дамах будзе вызначаць рынкавы механізм у залежнасці ад парытэту існуючага попыту і прапановы, аднак... У дамах сацыяльнага жылля, якія належаць дзяржаве, арэндная плата за кватэры будзе мець акрэсленую крыху меншую тарыфікацыю, чым у даходных прыватных дамах на свабодным рынку.

Сяргей КУРКАЧ.

ХАРАКТАРЫСТЫКА ЖЫЛЛЁВАГА ФОНДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (НА ПАЧАТАК 2007 ГОДА)

	Колькасць насельніцтва, тыс. чалавек	Колькасць кватэр, адз.	Колькасць кватэр на 1000 насельніцтва	Сярэдняя плошча кватэры, м²
Рэспубліка Беларусь	9714,5	3842403	395,5	55,21
Брэсцкая	1439,5	557163	387,1	57,65
Віцебская	1283,2	542902	423,1	52,79
Гомельская	1475,9	639520	433,3	51,26
Гродзенская	1114,1	443885	398,4	58,40
г. Мінск	1797,5	616818	343,2	53,77
Мінская	1466,8	563786	384,4	58,85
Магілёўская	1137,5	478329	420,5	54,99
У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу				
Рэспубліка Беларусь	7074,8	2552319	360,8	53,77
У сельскіх населеных пунктах				
Рэспубліка Беларусь	2639,7	1290084	488,7	58,05

Сакавітая СПРАВА



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Устанеш у шэсць раніцы, — расказвае Людміла, — лясная цішыня, якую перарываюць толькі першыя птушыныя песні. Паветра чыстае, гаючы бярозавік, змена гарадской абстаноўкі на сапраўднае прыроднае асяроддзе, — людзі за экалагічны турызм такія грошы плацяць. А тут — задарма (смяецца). Пазней, калі мы справімся з планам пастаўкі для прадпрыемства, а сок яшчэ будзе, прывязуць з лясніцтва талоны, пачнём адпускаць прадукт насельніцтву. Пачнуць ехаць людзі, столькі будзе сустрэч, цікавых суразмоўцаў. Аднойчы заехаў да нас навуковец, вельмі дасведчаны чалавек у пытаннях хімічнага складу соку, яго вітамінах, мінеральных рэчывах, цэлую лекцыю нам прачытаў, каб мы былі больш «падкаваныя» наконт таго, што нарыхтоўваем і прадаём. Кожную вясну мы робім шмат здымкаў, вядзём хроніку, гісторыю сваіх вясновых нарыхтоўчых кампаній.

Людміла працуе разам з мужам, Мікалаем Козічам, лесніком Пятровіцкага лясніцтва Кобрынскага эксперыментальнага лясгаса. Пастаўляюць яны сок Кобрынскаму кансервавому заводу. Абавязаліся нарыхтаваць для прадпрыемства гэтым разам 50 тон сыравіны. Сёлета да Мікалая і Людмілы далучылася яшчэ адна сямейная пара цёзак па прозвішчы, Алена і Валянцін. Працоўны дзень у нарыхтоўшчыкаў пачынаецца а сёмай гадзіне, калі трэба сабраць сок ад кожнай з тысячы падсочаных бярозак. Пасля ночы «ўраджай» бывае да пяці тон. Нялёгка перанесці і зліць у бочкі такую колькасць вадкасці. Таму бацькам дапамагаюць сыны сямействаў. Калі раніняя справа падыходзіць да канца, гаспадыні пачынаюць завіхацца на паходнай кухні і гатуюць сняданак. Для аўтара гэтых радкоў было адкрыццём, што літаральна ўсе стравы можна рыхтаваць на бярозавым соку. Са школьных гадоў памятаючы няўдалую спробу дзядзькі, героя коласаўскай «Новай зямлі» зварыць клёцкі на соку, я наіўна думала, што бярозавік для гатавання не падыходзіць. Людміла з Аленай развеялі гэты міф ушчэнт. Яны вараць з соку супы і баршчы, вараць бульбу, бо чыстай вады ў лагеры проста няма. А кава, якой мяне пачаставалі, была проста казкай. Сок прыдае ёй пікантную кіслінку, водар напою захоўвае лепш чым вада. Жанчыны падзяліліся сваім фірменным сакрэтам спецыяльна для чытачоў «Звязды». Шашлык яны замочваюць не ў звычайнай заліўцы з воцатам, а ў бярозавым квасе, тады канчатковы прадукт атрымліваецца намнога мякчэйшым і смачнейшым. Квас выспявае літаральна за некалькі дзён, калі ў свежы сок кінуць скарыначку хлеба і пакласці дзве-тры разынкі на паўтаралітровую бутэльку.

Пра гаючыя ўласцівасці натуральнага бярозавага соку сказана і напісана апошнім часам нямала, і ў самой прыродзе можна знайсці таму пацвярджэнне. Аказваецца, хітры дзяцел увесь сезон соку каруху спяшаецца ўмацоўваць свой арганізм. Для гэтага ён прабівае кару, робіць адтулінкі і п'е сок прама з дрэва.

Спяшацца трэба і леснікам-нарыхтоўшчыкам. Рэзкае пацяпленне можа скараціць тэрміны збору соку. Для гэтай кампаніі найлепшае надвор'е, калі на градусніку ўсяго некалькі дзяленняў са знакам плюс, а ноччу нават невялікія замаразкі. Аказваецца, сок не замярзае, як скажам, вада нават пры нулі градусаў, усяго толькі ўтвараецца на месцы струменьчыка невялікі лядзяшык, а па ім бягуць кроплі. Паводле слоў Мікалая Козіча, такі ранні пачатак руху соку, калі на дзялянкі выходзілі напярэдадні жаночага дня, на яго памяці другі раз, летась дрэвы падсочылі 10 сакавіка, а пазалетась — 27-га.

Сёлета ў першай дэкадзе сакавіка прыступілі да нарыхтоўкі соку большасць лясгасаў Брэстчыны. У плане, складзеным на аснове заявак прадпрыемстваў, — крыху больш за чатыры тысячы тон па вобласці. Усё, што звыш названай лічбы, будзе прадавацца насельніцтву. Цяпер літр бярозавіку каштуе 160 рублёў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЖЫЦЦЕАПАНТАНЫ НЯЎРЫМСНІК

Сёння спаўняецца 70 гадоў старшыні Рады Беларускага фонду культуры Уладзіміру Гілепу



Фота Юрыя ІВАНОВА.

Гэтага чалавека я не магу ўявіць без справы, па-руску кажучы «праздно шатающимся». На гэта ў яго проста няма часу. І жадання. І ніколі, напэўна, не было. І ўжо не будзе. Такі характар мае Уладзімір Аляксандравіч Гілеп. Ну хто б на яго месцы мог сёння пахваліцца, што шмат гадоў маючы пенсію, ён не сядзіць ні дома, ні на дачы, хоць на гэтым лапіку вязынкаўскай зямлі ён таксама дбайны гаспадар, рупны земляроб і нястомны паляпшальнік быту, пабудоў, калядачнага лесу, не ляжыць на траўцы тварам да сонца?

Трынаццаты год узначальвае ён Беларускі фонд культуры. Як вы зразумелі, на грамадскіх пачатках, у што ніяк не магуць паверыць пільныя збіральнікі падаткаў, час ад часу спрабуючы падлавіць яго. А ён — мала што ў фондзе шчыруе на ўсю моц за бясплатна, дык і яшчэ адну грамадскую ношу ўзваліў на сябе, і таксама бясплатную, дакладней — беззарплатную. Пяць гадоў ужо з'яўляецца галоўным рэдактарам першай у нашай краіне і адзінай «Краязнаўчай газеты». Ды яшчэ і адзін з заснавальнікаў яе. А ў рэдакцыі той супрацоўнікаў — і пальцаў адной рукі замнога.

Вось цяпер і памяркуйце, колькі «страчанай матэрыяльнай выгады» недабірае Уладзімір Аляксандравіч. Але справу сваю робіць — як дай Бог кожнаму, бо не ўсякі і за грошы хацеў бы і рабіў бы тое ж і столькі. А ён — як салдат, якога некалі паставілі на пост вартавога і забыліся зняць. Кожны дзянёчак раным-раненька задоўга да пачатку ўсеагульнага працоўнага дня, найчасцей пешкі, ідзе ён у Траецкае прадмесце, дзе і Фонд культуры, і рэдакцыя газеты.

А там ужо, між чытаннем матэрыялаў чарговага нумара, — людзі, людзі, людзі... Яны ідуць у фонд, не, не столькі ў сам фонд, як менавіта да Гілепа, са сваімі прапановамі, праблемамі і нават балячкамі, якія датычацца не адно іх, найперш — не іх. Бо збяражэнне беларускай культуры, мовы, захаванне нашай спадчыны, фальклору, развіццё краязнаўства, бібліятэк і шмат што іншае, вядома ж, клопат не аднаго Гілепа і нават не аднаго Фонда культуры. І дзякаваць Богу, думаю я, што не звяліся такія людзі, не ўсіх захліснула абыякавасць, бо неспалучальныя гэта словы і паняцці: культура і абыякавасць.

Так сталася па жыцці, што менавіта з асобай У.А. Гілепа атаясамліваюцца многія карысныя праекты ў сферы культуры, і найперш спроба скрануць з месца цяжкавагавую праблему вяртання нашых каштоўнасцяў з-за межаў Беларусі. Хіба не пра тое сведчыць выданне Фондам культуры кніг серыі «Вяртанне», намаганні надаць гэтай справе дзяржаўнае гучанне?

Людзі ідуць да Гілепа, бо ведаюць яго бязадмоўную натуру, а яшчэ — ягоную глыбокую дасведчанасць у галіне культуры, аховы помнікаў (а як жа — сам некалі і ў археалагічных раскопках браў удзел, і ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны працаваў), ягоную напорыстасць у вырашэнні праблемы, якой ён «захварэе». Ой, як жа часта даводзіцца яму «хварэць». Але хай бы Бог дараваў яму толькі гэтую хваробу і ніякіх больш.

Што ж да дасведчанасці, то яна, відаць, традыцыйная, нязменная, можна сказаць — пажыццёвая.

Так сталася, што маё першае руканне з Уладзімірам Аляксандравічам адбылося ў тым высокім партыйным, як яго называлі «чырвоным доме», дзе за савецкім часам вызначалася галоўная палітыка не адно ў самой палітыцы (гэтага права ў саюзных рэспублік, што праўда, было якраз найменш), не толькі ў эканоміцы, але (што складала мо найбольшы партыйны клопат) і ў сферы ідэалогіі і культуры.

Вядома ж, ЦК КПБ быў тады заканадаўцам моды (наколькі дазвалялі лейцы з ЦК КПСС) ва ўсіх сферах беларускага жыцця. Калі я прыйшоў у 1980 годзе ў сектар мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ, там ужо была «магучая кучка»: Сяргей Законнікаў, Уладзімір Гілеп, Іван Вашкевіч, Мікалай Карпенка, Іван Пашкевіч, Паўла Украінец, Іван Антановіч і іншыя дасведчаныя ў сваёй сферы людзі.

Дасведчаныя не па пасадах, а па ведах, здольнасцях, магчымасцях, вопыце, нарэшце. Выпрабаваных не адной грунтоўнай справай у культуры, загартаваных не толькі працоўнымі буднямі, суботамі ды нядзелямі, але і позневечаровымі (часам ажно чыя-небудзь клапатлівая жонка чыгунок з гарачай бульбай перад поўначчу прыносіла) у дзесяты раз пісаннямі-перапісваннямі чарговых запісак, дакладаў, аналізаў, даведак — не, не хопіць моўнага запасу, каб пералічыць усё тое, што даводзілася пісаць бедным інструктарам і не больш вольным за іх загадчыкам сектараў.

Дык мо адтуль гэткая працавітасць і выносівасць і ў Гілепа, былога загадчыка сектара мастацтваў аддзела культуры? Цэкоўская загартоўка, так сказаць, памножаная на партыйную адказнасць і асабістыя якасці характару. І кажу я гэта зусім сур'ёзна, без усялякай, нават маленечкай нацяжкі і без жарту, а тым больш пацьвельвання. Хто сам прайшоў тую партыйную школу — не дасць схлусіць, а хто ведаў пра тое, як працуюць там, калі сумленны, — пацвердзіць. І пацвярджалі, і пацвярджаюць — не адно пра Гілепа і не толькі з ліку людзей творчых, якія найбольш ведалі нашы «цэкоўскія працоўныя будні».

Згадаю хоць некаторыя з тых праектаў (што помняцца) падчас дацэкоўскай і цэкоўскай працы Уладзіміра Аляксандравіча, да ажыццяўлення якіх ён меў дачыненне. Знакаміты комплекс «Хатынь», не менш знаны Курган Славы пад Мінскам, пачатковы — падрыхтоўчы і ўстаноўчы — этап стварэння зноў жа знакамітай серыі кніг «Памяць»...

Дык мо і за такое працалюбства павысілі незазабаве Уладзіміра Аляксандравіча да пасады намесніка міністра культуры? Справядліва і заканона, так мы, ягоныя калегі, меркавалі. Ну, а калі ён і там не здрадзіў практыцы не толькі суботняга ды нядзельнага шчыравання, мы лішні раз пераканаліся, што не ўсё залежыць ад пасады, многае — ад характару і выхаванасці. І з той пасадай Уладзімір Аляксандравіч справіўся як найлепей. І зноў побач з ім заўсёды было шматлюдна — адчувалі людзі ягоную ўважлівасць і ўважнасць да думкі іншага, ягоную спагадлівасць (але не добранькага чалавека), ягонае імкненне да ўсяго дакапацца самому і самому ж многае зрабіць.

І пазней ужо, калі самастойная Беларусь наноў фарміравала свае кіраўнічыя кадры, не магла яна пакінуць без увагі вопыт, здольнасці і магчымасці Гілепа. Ягоная праца на пасадзе першага намесніка міністра культуры, а пасля культуры і друку была хоць і цяжкай (а дзе ж вы бачылі бясхмарны і бесперашкодны перыяд станаўлення?), але выніковай. Я гэта магу засведчыць з усёй адказнасцю. Маю вопыт сумеснай працы. Бачыў сваімі вачыма — а ім я пакуль што давяраю.

Таму магу сцвярджаць — з такім чалавекам я асабіста згодны не адно ў разведку пайсці. Ён не падвядзе, не спасуе, не перакладзе адказнасць на іншага, а тым больш ніколі не схаваецца за спіну некага. Не такога заводу.

Мо ад бацькі свайго — выношлівага вайскоўца Аляксандра Васільевіча — пераняў гэткую працоўную ўпартасць?

Ці мо ў маці (мамкі, як дагэтуль заве яе) — сённяшняй 90-гадовай случанкі Марыі Пракопаўны навучыўся і да людзей прыслухоўвацца, і з павагай да іх ставіцца, і дапамагаць, і разам з імі пасмяяцца ды па-добраму пакпіць не адно з сябе?

Так ці інакш, а ўжо ўнучка ягоная Леначка пераймае дзедаў досвед і спазнае ягоную школу жыцця, разам ходзячы то ў музей, то на канцэрт, то на выстаўку. А што да дачкі Наташы, сына Андрэя ці жонкі Рымы Віктараўны (такой жа нястомнай і настойлівай, гэткай жа апантанай дабрынёй і спагадлівасцю), то яны ўжо і не заікаюцца пра тое, каб пакінуў дзед, бацька і муж сваё грамадскае шчыраванне. Ведаюць — марная трата слоў і часу. Без гэтага Гілеп не быў бы Гілепам, а яны не былі б ягонымі вернымі і надзейнымі спадарожнікамі па жыцці.

Я таксама веру ў гэта. І спадзяюся, што так будзе яшчэ не адзін год. Бо калі на сёлетнім справаздачным сходзе Беларускага фонду культуры ягоны старшыня У.А. Гілеп заікнуўся, каб папрасіцца ў адстаўку, людзі не пажадалі прыняць яе, угаварылі Уладзіміра Аляксандравіча застацца.

А людзей ён падводзіць не ўмее.

Анатоль БУТЭВІЧ.

МУЖЧЫНЫ СВАРАЦЦА, ЖАНЧЫНА Ў СКЛЕПЕ

У Бабруйску давялося распачынаць крымінальную справу адразу па трох артыкулах Крымінальнага кодэкса: незаконнае пазбаўленне волі, пагроза забойствам і ўчыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Ва ўсім гэтым падазраецца 25-гадовы бабруйчанін.

У ноч з 8 на 9 сакавіка ў прыватным доме на вуліцы Мопра гаспадар дома расварыўся з суседам, амаль што аднагодкам, і пырнуў госця нажом у жывот. Ранены малады чалавек дапоўз да свайго дома, суседзі выклікалі «хуткую дапамогу», а медыкі паведамілі пра нажавое раненне ў міліцыю. Калі нарад прыехаў затрымаць вінаўніка здарэння, то ў склепе дома знайшлі 20-гадовую дзяўчыну. Выяўлена, што гаспадар сілай утрымліваў яе ў склепе і пагражаў забойствам. Можа, рэўнасць была прычынай жорсткай сваркі маладых людзей? Гэта высветліцца пазней у выніку расследавання.

Алена КАЗЛОВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

«ЗАМІНІРАВАЛІ» РЭЙСАВЫ ЛАЙНЕР, НА ЯКІМ «ЭКАНОМІЎ» ПОЛЬСКІ ПРЭМ'ЕР

Прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск, міністр замежных спраў Радаслаў Сікорскі ў складзе афіцыйнай дэлегацыі вылецелі з Польшчы ў ЗША. Калі самалёт знаходзіўся ў паветры, у прадстаўніцтва польскай авіякампаніі LOT у Нью-Йорку патэлефанаваў невядомы і паведаміў, што на борце закладзена шасцікілаграмовая бомба. Ахова прэм'ер-міністра агледзела самалёт, які ляцеў над акіянам, але бомбы не знайшла.

Калі лайнер прызямліўся ў Нью-Йорку, узлётна-пасадачная паласа была ачэпленая паліцыяй, а ўздоўж яе выстаўленыя пажарныя аўтамабілі. Дэталёвы вобыск самалёта на зямлі таксама не прынёс станоўчых вынікаў. Дональд Туск прыбыў у ЗША са спазненнем на 40 хвілін.

Адмысловы момант складаецца ў тым, што ў мэтах эканоміі польская ўрадавая дэлегацыя вылецела ў ЗША не самалётам урадавага авіяатрада, а звычайным рэйсавым лайнерам маршруту Варшава-Нью-Йорк. Аналітыкі лічаць, што інцыдэнт, хутчэй за ўсё, уняслі істотныя карэктывы ва ўрадавую праграму эканоміі сродкаў і прымусіць кіраўніка ўрада Польшчы лётаць на ўрадавым лайнеры Ту-154.

ЧЫНГІЗА АЙТМАТАВА ЗНЯЛІ З ПАСАДЫ ПАСЛА КІРГІЗІІ Ў ЕЎРОПЕ

Вядомы пісьменнік Чынгіз Айтматаў вызвалены ад пасады пасла Кіргізіі ў Францыі, Бельгіі і Нідэрландах. Адпаведны ўказ падпісаў прэзідэнт Кіргізіі Курманбек Бакіеў. Пісьменнік таксама быў пастаянным прадстаўніком Кіргізіі пры Камісіі еўрапейскіх супольнасцяў, у НАТА і пры ЮНЕСКА па сумяшчальніцтве.

Пісьменнік Чынгіз Айтматаў займаў дыпламатычную пасаду, прадстаўляючы Кіргізію ў шэрагу краін Еўропы, з пачатку 1990-х гадоў. У снежні 2008 года пісьменніку споўніцца 80, і гэты год у рэспубліцы абвешчаны годам Айтматава.

УПЕРШЫНЮ ЗА ПАЎТАРЫ ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ ВАТЫКАН «АСУЧАСНІЎ» СПІС СЯМІ ГРАХОЎ

Праз паўтары тысячы гадоў Ватыкан вырашыў асучасніць спіс сямі смяротных грахоў, прыстасаваўшы яго да эпохі глабалізацыі. Новы пералік апублікаваны ў ватыканскай газеце L'Osservatore Romano.

Біскуп Джанфранко Джыроці, кіраўнік Апостальскага пенітэнцыярыя — царкоўнага трыбунала, які адказвае ў Ватыкане за споведзь і адпушчэнне грахоў, пасля тыднёвага семінара для святароў, падкрэсліў, што святарам неабходна прымаць да ўвагі «новыя грахі, што з'явіліся на гарызонце чалавецтва ў сувязі з працэсам глабалізацыі». «Вы абражаеце Бога не толькі тады, калі крадзяце, блюзнерыце або жадаеце чужую жонку, але і калі руйнуеце прыроду, праводзіце сумніўныя з пункту гледжання маралі навуковыя эксперыменты, дапускаеце генетычныя маніпуляцыі па змене ДНК або эмбрыёнаў», — сказаў святар.

Біскуп Джыроці паведаміў таксама, што да смяротных грахоў адносяцца наркотыкі і сацыяльная несправядлівасць, з-за якой узнікае бедната. Паводле яго слоў, у цэнтры ўвагі Ватыкана па-ранейшаму застаюцца два такія смяротныя грахі, як аборты, што парушаюць «годнасць і правы жанчын», а таксама педафілія — грэх, які паразіў нават шэрагі святароў.

РУП «Белспецконтракт» проводит аукцион по продаже автомобильной техники

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

на 3-м открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 11 апреля 2008 г.

№№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км, наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	Грузовой Урал-43202 ш. 037648; дв. 744086	н.п. Боровка, в/ч 22313	1985	40 194	13 000 000	1 300 000
2.	Грузовой Урал-4320 ш. 066357, дв. 987614	г. Минск, в/ч 04147	1986	67 789	12 000 000	1 200 000
3.	Автошасси Урал-4320 ш. 0089942, дв. 200216	г. Бобруйск, в/ч 96869	1988	6 082	15 000 000	1 500 000

3-й аукцион состоится в 11.00 11 апреля 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 9 апреля 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 11 апреля 2008 г.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: 017 тел./факс 224 88 05. Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com**

Полис компании Би энд Би Иншуренс серии ББ № 0071895 **считать недействительным.**

Віншаванні

Віншуем з юбілеем ***Зою Антонаўну СІВУЮ.***

Жадаем мець вясёлы выгляд,
Не ведаць, дзе і што баліць,
Не хвалявацца без прычыны
І ў Бога лепшага прасіць.

Зяць Мікалай з сям'ёй.

Віншую са святам паважаную ***Наталлю РАТКЕВІЧ,*** *супрацоўніцу банка г. Беразіно. Жадаю моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту. Дзякую за спагадлівыя адносіны да кліентаў.*

Сярмяжка, г. Беразіно.

Кірмаш штотыднёвы рэкламны выпуск №9 (577)

аддзел рэкламы 287-17-79

Рэквізіты для аплаты: р/р 3012120270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АББЕСТКІ

Прадаецца

■ Кватэра 2-пакаёвая ў г. Мінску па вул. Асіпенкі, 18, тэлефон, балкон.
Тэл. 8 017 233 33 40, сотавы 325 67 07.

■ Зруб новы 5х5, балкі, кроквы і інш. Цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 01772 53 926, маб. 8 029 550 39 28.

■ Кватэра 2-пакаёвая, «сталінка», шклопакеты, шкафы-купэ, у г. Мінску па вул. Кісялёва.
Тэл. 8 017 334 38 62.

■ Кватэра 3-пакаёвая, каапératыўная, маецца тэлефон, гараж у райцэнтры г. Гарадок (30 км ад Віцебска).
Тэл. 8 0212 48 08 09, 8 029 216 17 09.

■ Недабудаваны драўляны дом з прыбудовай, зручны для перавозу, у в. Каменка Шчучынскага раёна.
Тэл. 8 01514 34 547.

■ Катэдж цагляны 2-павярховы, маюцца г/п, газ, вада, сад, агарод. Нядорага, тэрмінова.
Маб.тэл. 889 95 10.

■ Дом драўляны, г/п, 60 сотак зямлі.
Тэл. 8 01794 46 235.

■ ВАЗ-21063, 1988 г.в., 1,3 б, бэжавы, выдатны стан (г. Слуцк).
Тэл. 8 029 328 04 40.

■ «Вольва 460», 1,8, г/б, седан, ТА-2008 г.
Тэл. маб. 269 01 24.

■ Трактарны прычэп 2 ПТС-2, аднавосевы, касілка ротарная.
Тэл. 8 029 699 80 87.

■ Воз конны на гумавым хаду, збруя, плуг конны, сена.
Тэл. 8 01794 46 235.

■ Расада высокаўраджайных клубніц, нядорага.
Тэл. 8 01797 36 711 пасля 21.00.

■ Баян «Тула 302», 7 рэгістраў, выбарны.
Тэл. 8 02357 220 29, 8 044 792 05 82.

■ Млын-драбілка, 380 в, 5,5 кВт, кормарэзка 380 в, 3 кВт.
Тэл. 8 029 133 97 24.

■ Кацёл ацяпляльны, бытавы, нядорага (г. Слуцк).
Тэл. 8 029 564 61 42.

■ Пральная машына «Волна 5М». Новая, танна.
Тэл. 8 017 271 84 60.

Розное

Мяняю 4-пакаёвую кватэру, 2-і паверх, у г. Шчучыне на кватэру ў Гродне.
Тэл. 8 01514 29 546.

■ Мяняю 2-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў Віцебску і 3-пакаёвую кааператыўную ў райцэнтры г. Гарадок на кватэру ў Мінску або Санкт-Пецярбургу.
Тэл. 8 029 216 17 09, 8 0212 78 08 09.

Куплю

■ Дрэваапрацоўчы станок на 220 В.
Тэл. маб. 269 01 24.

■ Тэадаліты: ТТ-4, Т-5, Т-30 і іншыя.
Тэл. 8 029 960 69 71.

■ Матаблок або трактар МТЗ.
Тэл. 8 01717 56 912, 8 029 774 49 81.

■ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 17.

■ Дом.
Тэл. 8 029 778 33 38.

■ Памяшканне пад вытворчасць, склад, офіс, магазін.
Тэл. 8 029 682 14 42.

■ Куплю да IFA-50/60: рухавік, каленвал, шасцерні, валы, дыскі, ТНВД і інш.
Тэл. 8 10380 688 44 68 89.

Утерянный диплом библиотекаря на имя **Нкодо Минджимба Феликс**, выданный М.И.К. в июне 1994 года, **считать недействительным.**

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі

220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287 17 79.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

Открытого акционерного общества «Хорошее настроение» за 2007 г.

АКТИВ	*на конец отчетного года в млн. руб.*	*ПАССИВ*	*на конец отчетного года в млн. руб.*
Основные средства	2240	Уставный фонд	83
Вложения во внеоборотные активы	1	Добавочный фонд	2373
Нематериальные активы	1	Непокрытый убыток	-217
Запасы и затраты	52		
Налоги по приобрет. ценност.	21	Доходы будущих периодов	—
Товары, готовая продукция	51	Прибыль (убыток) отчетного года	—
Товары отгруженные	—		
Дебиторская задолженность	28	Краткосрочные кредиты и займы	—
Денежные средства	16	Кредиторская задолженность	188
Расходы будущих периодов	17		
БАЛАНС	2427	БАЛАНС	2427

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

с 1 января 2007 г. по 31 декабря 2007 г. Открытого акционерного общества «Хорошее настроение»

1.	**Доходы и расходы по видам деятельности**	**млн. руб.**
	Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	1272
	Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	218
	Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	1054
	Себест

Лепельскія лебедзі

Вялікая лебядзіная калонія ўтварылася гэтымі днямі на паўднёва-заходняй частцы Лепельскага возера. Нягледзячы на міграцыю, колькасць белага птаства — не менш за сорак пар.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

«4 колы» з прабегам

У Мінску адкрыўся першы прафесійны салон па продажы патрыманых аўтамабіляў

Зразумела, што самы лепшы аўтамабіль — новы. Аднак для пераважнай большасці беларусаў новая іншамарка застаецца пакуль нязбытнай марай. Паводле звестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, машыны, якія былі ў карыстанні, складаюць каля 90 працэнтаў усяго імпарту легкавушак у нашу краіну. Напрыклад, у Мінску, паведамляе Дзяржаўтаінспекцыя, летась былі зарэгістраваны 140 694 аўтамабілі, з якіх толькі 7707 — новыя. Зазвычай беларусы набываюць патрыманыя аўто на аўтарынках альбо па аб'явах у СМІ ці Інтэрнэце. А гэта тоіць шэраг непрыемных сюрпрызаў. Можна купіць сапсаваную машыну, якая разваліцца праз некалькі дзён пасля набыцця. Існуе таксама верагоднасць прыдбаць крадзенае аўто з «перабітымі» нумарамі кузава і рухавіка. Словам, рызыка падчас такіх пакупак вялікая. Зменшыць яе ў нашай краіне спрабавалі некалькі гадоў таму, калі былі адкрыты свабодныя мытныя склады. Але яны не вытрымалі цэнавай канкурэнцыі з прыватнымі перагоншчыкамі машын. Беларусы, не зважаючы на рызыку, аддаюць перавагу набыццю аўтамабіляў з рук, бо яны значна таннейшыя. І вось, у рэшце рэшт, гэтая «гульня ў аўтарулетку» можа скончыцца. Дакладней, у нас з'явілася магчымасць купіць патрыманы транспартны сродак без рызыкі быць падманутымі. Днямі ў Мінску адкрыўся першы прафесійны салон па продажы аўтамабіляў з прабегам «4 колы». Як паведаміў дырэктар аўтасалона Аляксандр Рабушка, асноўны акцэнт будзе зроблены на продаж недарагіх аўтамабіляў, імпартаваных з ЗША і краін Заходняй Еўропы, коштам ад 5 тысяч да 10 тысяч долараў. Разам з тым на пляцоўцы аўтасалона будуць прысутнічаць і даволі дарагія машыны. У прыватнасці, ужо цяпер пад дахам аўтасалона стаяць шыкоўныя «Додж Магнум», «Лінкальн Тан», «Крайслер 300 лімітэд», «Лексус 300». Цана на гэтыя іншамаркі для сярэднестатыстычнага беларуса, праўда, кусаецца. Памянёны «Додж Магнум» 2004 года выпуску каштуе 25 тысяч долараў. Аднак Аляксандр Рабушка запэўніў, што па замове кліента супрацоўнікі аўтасалона знойдуць за акіянам, у Заходняй Еўропе ці нават у Паўднёвай Карэі легкавушку на любы густ і кошт. Вось толькі заказчыку давядзецца пакінуць заклад у памеры прыкладна 30 працэнтаў ад агульнага кошту пакупкі.

У беларусаў нарэшце з'явілася магчымасць набыць патрыманы аўтамабіль з цвёрдай гарантыяй, што ён не сапсаваны, не крадзены і не сабраны з ламачча.

У аўтасалоне таксама будуць прадаваць машыны ў лізінг і ў крэдыт. Існуе нават спецыяльная крэдытная праграма, паводле якой спаганяюцца толькі працэнты за карыстанне аўтамабілем, а асноўны доўг можна будзе выплаціць праз 3 гады. Прычым прадастаўляецца магчымасць нават прадаць гэтае аўто альбо перааформіць яго яшчэ на 5 гадоў. Пры жаданні тут можна «абмяняць з даплатай» сваю машыну на іншую альбо проста выставіць у салоне «жалезнага каня» на продаж.

Адметна, што аўтасалон «4 колы» дае гарантыю на патрыманыя машыны тэрмінам на 3 месяцы незалежна ад таго, колькі кіламетраў праедзе за гэты час аўтамабіль. Перад продажам кожны аўтамабіль праходзіць поўную дыягностыку і адмысловую падрыхтоўку. Прадавец таксама гарантуе, што транспартны сродак не знаходзіцца ў вышуку і яго не сабралі з ламачча пасля аварыі.

Так што перавагі «4 колаў» над канкурэнтамі з аўтарынкаў відавочныя. І цэны ў аўтасалоне на машыны сярэдняга класа, як запэўніў Аляксандр Рабушка, будуць не вышэйшыя, чым на рынках, а можа нават і ніжэйшыя. Дырэктар «4 колаў» лічыць, што яму і яго партнёрам удасца адолець «перагоншчыкаў» за кошт павелічэння аб'ёмаў продажаў. У дадзены момант пад дахам аўтасалона знаходзяцца некалькі дзесяткаў машын, але праз некаторы час, як запэўніў Аляксандр Рабушка, іх будзе не менш за сто. Хоць павелічэнне аб'ёму продажу машын для дырэктара «4 колаў» — не самамэта. «Задача нашага аўтасалона не толькі ў тым, каб сфарміраваць у спажыўца давер да продажу аўтамабіляў з прабегам у салонах, але і закласці аснову новай, больш сучаснай культуры аўтааматарства, узняць яе на еўрапейскі ўзровень», — заявіў Аляксандр Рабушка.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.33	18.06	11.33
Віцебск —	6.24	17.55	11.31
Магілёў —	6.23	17.57	11.34
Гомель —	6.19	17.54	11.35
Гродна —	6.48	18.22	11.34
Брэст —	6.48	18.23	11.35

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Ганны, Івана, Парфірыя, Пятра, Севасцьяна, Сяргея.*
К. *Бенядыкта, Канстанціна.*

Надвор'е на заўтра



Геамагнітныя ўзрушэнні

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— малая геамагнітная бура

...у суседзяў

Варшава +12..+14°С	**Кіеў** +9..+11°С	**Рыга** +6..+8°С
Вільнюс +5..+7°С	**Масква** +2..+4°С	**С.-Пецярбург** +2..+4°С

Дзве даты

11 сакавіка

1903 год — 105 гадоў з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта і перакладчыка Тодара Кляшторнага. З'яўляўся членам літаратурных арганізацый «Маладняк», «Узвышша», Беларускай арганізацыі пралетарскіх пісьменнікаў. Аўтар паэтычных зборнікаў «Кляновыя завеі», «Святлацені», «Ветразі». Рэпрэсаваны ў 1937 годзе. Рэабілітаваны ў 1957-м.

1918 год — 90 гадоў таму на Мікалаеўскі (зараз Ленінградскі) вакзал Масквы з Петраграда прыбыў цягнік з членамі савецкага ўрада на чале з У.І. Леніным. На наступны дзень Масква будзе аб'яўлена сталіцай Расійскай Савецкай Рэспублікі.

Цытата дня:

«Шлюб — гэта ліхаманка, якая пачынаецца жарам, а заканчваецца холадам».

Гіпакрат (460—370 да н.э.), старажытнагрэчаскі ўрач, «бацька медыцыны».

Дэмаграфія

Пазнейшыя роды — даўжэйшае жыццё?

Усё больш беларусак нараджае пасля 30 і нават пасля 40 гадоў

Такая тэндэнцыя характэрная, як вядома, для эканамічна развітых краін, дзе жанчыны дазваляюць сабе раскошу выхавання дзяцей пасля таго, як атрымана адукацыя, зроблена кар'ера, наладжаны дабрабыт і г.д. У сённяшняй Вялікабрытаніі, напрыклад, сярэдні ўзрост жанчыны, якая нараджае першае дзіця, складае 35 гадоў. Паводле слоў прафесара, доктара медыцынскіх навук, намесніка дырэктара Навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Вольгі ХАРКЕВІЧ, Беларусь чакае такі ж самы расклад. Ужо зараз статыстыка сведчыць аб павелічэнні ўзросту беларусак, якія ідуць на ўсвядомленае дзетанараджэнне.

Да таго ж, Сусветная арганізацыя аховы здароўя называе сярод фактараў, якія ўплываюць на працягласць жыцця і здароўе чалавека, і познія роды. Мяркуецца, што гэта звязана найперш з пазітыўнымі эмоцыямі, станоўчым стрэсам.

Як адзначае Вольга Мікалаеўна, сёння ў краіне многае робіцца для таго, каб палепшыць сітуацыю ў галіне аховы мацярынства і дзяцінства. У прыватнасці, пераасназначаныя ўсе перынатальныя цэнтры ў абласцях і створаны РНПЦ «Маці і дзіця» — самы высокі ўзровень аказання акушэрска-гінекалагічнай дапамогі жанчынам з усёй рэспублікі. Гаворка, праўда, ідзе пра выпадкі найбольш цяжкай паталогіі, напрыклад, выражаныя парокі сэрца, хваробы крыві, трамбозы глыбокіх венаў ног (менавіта гэта паталогія займае ва ўсіх краінах першае месца ў структуры мацярынскай смяротнасці), хваробы пячонкі, а таксама непасрэдна акушэрскай паталогіі, калі прагназуецца верагоднасць аказання дапамогі ў спецыялізаваных цэнтрах. Сярод іх — Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр медыцынскіх тэхналогій, новых лекавых сродкаў і аховы здароўя, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр трансфузіялогіі і медыцынскай біятэхналогіі, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Кардыялогія», Рэспубліканскі клінічны навукова-практычны цэнтр эндакрыналогіі і абменных парушэнняў, Рэспубліканскі клінічны навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, Рэспубліканскі клінічны навукова-практычны цэнтр траўматалогіі і ортапедыі, Рэспубліканскі клінічны навукова-практычны цэнтр неўралогіі і нейрахірургіі, Рэспубліканскі клінічны навукова-практычны цэнтр аднаўленчай медыцыны і рэабілітацыі, Рэспубліканскі клінічны навукова-практычны цэнтр «Хірургія», Рэспубліканскі клінічны навукова-практычны цэнтр «Медыцынскія тэхналогіі», Рэспубліканскі клінічны навукова-практычны цэнтр «Медыцынскія тэхналогіі, тэхніка і інфарматыка